защита от пиратства. Украина сечас переживает времена испытаний. И сейчас в нашей стране нет корпорации, которая бы взяла на себя задачи государственного масштаба. Поэтому важно объединить научное сообщество, чтобы популяризировать наши украинские символы совершенно бесплатно. Чтобы создать научные проекты по направлениям сотрудничества искусствоведов-дизайнеров-программистов для продвижения национальной украинской орнаментики в Интернет сети.

Популяризация украинской орнаментики через мультимедийные средства – это задача ученых для широкой общественности в Интернет сетях.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. Булгакова, Л. Н Етнокультурна характеристика народної вишивки Поділля (кінець XIX – 30-і роки XX ст.). Автореф. дис. – Львів, 2000. – 20 с.
2. Лупій, Т. Ф Рушники Західного Полісся кінця XIX – п. пол. XX ст. Автореф. дис. – Львів, 2002. – 20 с.
3. Андрунко, Л. М Український рушник – поліфункціональний сакральний твір народного мистецтва. Автореф. дис. – Львів, 2009. – 17 с.
4. Семчук, Л. Я. Вишивка в народному одязі Українських Карпат XX століття Автореф. дис. – Івано-Франківськ, 2009. – 16 с.
5. Пилип, Р. І Художня вишивка українців Закарпаття XIX – першої половини XX ст. Автореф. дис. – Львів, 2011. – 16 с.
6. Селівачов, М. Р. Лексикон української орнаментики (іконографія, номінація, стилістика, типологія). – Київ, 2005. – 400 с.
7. Дядюх-Богатько, Н. Й, Куць Я. Й. Шрифт в мультимедійному середовищі // Тези міжнародної наукової конференції Ерделівські читання. – Ужгород, 2013. – С. 78–81.
8. Пікіпенко, Ю. І Орнамент як джерело дослідження етнічної культури України. Автореф. дис. – Київ, 2004. – 21 с.
9. Коновалова, О. В Антропоморфні мотиви української народної орнаментики XIX–XX століть. Автореф. дис. – Івано-Франківськ, 2010. – 19 с.
10. Польшина, О. Г. Психосемантичні особливості сприймання студентами народної орнаментальної символіки: Автореф. дис. – Київ, 2005. – 18 с.

***Здановіч Н. І***

*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

## ЧАЛАВЕК І СУСВЕТ ПРАЗ ПРЫЗМУ КЕРАМІЧНАЙ ФОРМЫ

Як вядома, у культуры няма ні чыста матэрыяльных, ні чыста духоўных з'яў, усе яны, па словах Ю. Сцяпанава, «ідуць парамі». І ў нашым выпадку гаршчок як прадмет уяўляе сабою канцэпт гаршка, яго мадэль, план. Эвалюцыйны рад яго ўяўляе сабою адзін з семіятычных ланцужкоў культуры.

**1. Неалітычны гаршчок як мадэль сусвету**

Вынаходніцтва керамікі ў перыяд неаліту стала адной з галоўных складовых частак «неалітычнай рэвалюцыі». Адзінай формай начыння быў вялікі гаршчок (вышынёй да 40 см пры дыяметры ў 35 см). І з самага пачатку ён выконваў ролю своеасаблівага «культурнага цэнтра» (калектыўнае спажыванне: у адзіным коле вакол сасуда з ежаю збіралася вялікая сям'я) і «культурнай прасторы». Паверхня глінянага начыння становіцца ў гэты час самай трывалай

паверхняй (у параўнанні з дрэвам і косцю) для кадавання інфармацыі. Гаршчок успрымаецца як сімвал сусвету з падзелам на зоны неба, зямлі і іншасвету (апошняя найчасцей пакідаецца неарнаментаванай з-за страху перад ім і таямнічай невядомасці). На раннім этапе неаліту, на першых гаршках найчасцей арнамент уяўляў сабою вертыкальныя ці дыяганальныя наколы, насечкі [1, с. 131], што сімвалізуюць сабою адчуванне існавання чалавека ў сусвеце – у прасторы пад неабсяжным небам. Чалавек раствораны ў прыродзе і яшчэ ніяк сябе не пазначае, але прысутнічае ў ім як сузіральнік.

На этапе позняга неаліту абавязковым элементам кампазіцый становяцца гарызантальныя стужкі з тых самых наколаў і насечак, як пазначэнне зямлі, на якой стаіць чалавек (тым самым ён заяўляе пра сябе, пра сваю прысутнасць), а спалучэнне дыяганальных і гарызантальных матываў азначае сувязь, апладненне зямлі нябеснай вільгаццю [1, с. 233, 234]. Як вядома, гэта быў час паступовага пераходу да прымітыўнага земляробства, калі чалавек назапашваў навыкі апрацоўкі зямлі.

У гэты ж час упершыню з'яўляюцца выявы трохкутнікаў [1, с. 233, 234] – матыву, які стане вядучым у арнаментальнай сістэме бронзавага веку. Гэты матыў прысутнічае на посудзе як на тэрыторыяў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, так і Афрыкі. Адно з тлумачэнняў такога тыпалагічнага мыслення – адлюстраванне ўзаранай зямлі – зямлі, падзеленай на асобныя часткі. У гэтым бачна своеасаблівае праяўленне сілы і ўпэўненасці чалавека, які свядома пазначае прастору свайго зямнога існавання і становіцца гаспадаром тэрыторыі, дзеліць яе на выразныя часткі.

Як вядома, менавіта трохкутнікі з'яўляюцца сімваламі мужчынскага (скіраваны вастрыём уверх) і жаночага (наадварот) пачаткаў у міфалогіі індусаў. У рымскай міфалогіі Юнону нярэдка пазначалі трохкутнікам [2]. Тым самым, магчыма, чалавек канчаткова пазначыў сваю прысутнасць у сусвеце, і адначасова выявіў пераходнасць часу канца неаліту – ад панавання жаночага пачатку, жанчыны як сімвала роду – да патрыярхату і панавання мужчыны. Тым больш што на кераміцы адлюстраваўся смелы крок на гэтым шляху да пераможнага панавання – у кампазіцыі са стылізаванымі постацямі мужчыны і качкі (татэма?) на гаршку з Юравічаў [1, с. 235].

**2. Керамічны посуд і сацыяльныя змены.**

Індаеўрапейцы, што прыйшлі ў Еўропу ў бронзавым веку, канчаткова змянілі сітуацыю ў сацыяльнай культуры на карысць вытворчай гаспадаркі (земляробства як галоўнага занятку у нас) і перамогі патрыярхату. Кампазіцыі з трохкутнікаў сімвалізуюць не толькі плоднасць зямлі, але усё больш – узаранае поле. З гэтага матыву нараджаецца зігзагападобны арнамент (лукатка). Як вядома, менавіта ў эпоху бронзы складваецца земляробчы каляндар беларусаў, сонечны па сваёй сутнасці. На ўсіх побытавых рэчах мы знаходзім сімвалы сонца як галоўнага гаранта ўраджаю і жыцця. На кераміцы гэта кружочкі і кружкі з кропкаю, а таксама крыжыкі, выкананыя адбіткам грабенчатага штампа [1, с. 381, 386].

Керамічнае начынне актыўна выкарыстоўвалася ў абрадавых дзеяннях. Менавіта кераміка недвусэнсоўна сведчыць пра развітасць культу продкаў у перыяд бронзы. Гэта адлюстравана ў традыцыі вырабу спецыяльнага пахавальнага посуду ў насельнікаў сярэднедняпроўскай культуры [1, с. 361], значна больш дасканалага, чым звычайная побытавая кераміка. Тым самым была праведзена выразная мяжа паміж светам жывых і памерлых. Была наладжана цэлая «індустрыя» вырабу пахавальнага посуду – тонкасценнага, высокамастацкага, абавязкова аздобленага арнаментам.

Адначасова кераміка сведчыць і пра змены ў самым побыце: здрабненне форм і іх разнастайнасць паказвае на пачатак працэсу індывідуалізацыі спажывання. Замест гаршкоў вядзёрнага аб'ёму робіцца посуд на 2–3 літры. Пераход ад акругладоннага да пласкадоннага посуду засведчыў канчатковую аселасць насельніцтва і з'яўленне стацыянарнага стала.

У жалезным веку працягваецца працэс развіцця функцыі індывідуалізацыі спажывання, што выявілася ў першую чаргу ў развіцці асартыменту посуду (з'яўляюцца нават начынні для піцця, вельмі падобныя да сучасных кававых кубачкаў) [3, с. 280–282]. Аднак жалезны век – час, калі ў кераміцы упершыню творчы пачатак саступае месца прагматычнаму. Яна амаль губляе арнаментыку, становіцца перш за ўсё ёмістасцю для ежы. У той жа час гэта стала стымулам для развіцця разнастайных керамічных форм (градацыя посуду на начынне для прыгатавання, спажывання і захоўвання прадуктаў) [3, с. 282–284]. На наш погляд, менавіта ў жалезным веку керамічны посуд упершыню асэнсоўваецца як аб'ект для творчасці: маецца на ўвазе выраб гліняных грузікаў мілаградцамі, многія з якіх па форме нагадваюць мініяцюрныя гаршчкі, старанна упрыгожаныя рыфленнем ці штампаваннем.

У жалезным веку з'яўляецца больш трывалы (у параўнанні з керамікай) матэрыял для захавання «культурных кодаў» – метал. Тым не менш, посуду па-ранейшаму адводзіцца вельмі важная роля ў «летапіснай» гісторыі чалавецтва: ён захоўвае ўласцівую яму з самага пачатку этнавызначальную функцыю. Калі ў перыяды неаліту і бронзы археолагі вызначаюць па ім тэрыторыі асобных археалагічных культур, то ў жалезным веку гавораць пра балцкія і славянскія керамічныя традыцыі. Прыкладам, менавіта ў славянскіх культурах пачынаючы з 6 ст. упершыню з'яўляецца новы від посуду – дыскападобныя патэльні.

У раннім сярэднявеччы, калі керамічная вытворчасць становіцца рамяством, у асартыменце і аздабленні посуду бачная сацыяльная арыентаванасць (сельская і гарадская, непаліваная і паліваная кераміка). Сацыяльная градацыя па маёмаснай прыкмеце асабліва выявілася ў эпоху Адраджэння, калі наладжваецца ўласная вытворчасць паліванай керамікі. Дзякуючы цесным сувязям з Еўропай у Беларусі распаўсюджваюцца як новыя тэхналогіі вытворчасці, так і новыя формы посуду [4]. Разам з тым, эпоха Адраджэння, якая прыпадае у Беларусі на перыяд канца XV – пачатку XVII ст., адметная яшчэ і фарміраваннем нацыянальных моваў. Таму не толькі традыцыйныя, «спрадвечныя» формы посуду замацоўваюць свае «імёны», але і новыя, запазычаныя формы называюцца ў адпаведнасці з мясцовай вербальнай культурай.

У 1909 годзе ў Германіі стаў выходзіць часопіс «Словы і Прадметы». Даследчыкі, што групаваліся вакол яго, працавалі па прынцыпе злучэння матэрыяльнага і

духоўнага, ствараючы своеасаблівыя матэрыяльна-духоўныя семіятычныя рады, усвядоміўшы вялікае значэнне аднаўлення не толькі ведаў пра сам прадмет, але і пра словы «натуральнай мовы», якімі пазначаецца гэты прадмет. Па гэтым прынцыпе паспяхова працуюць этнографы.

Мясцовыя назвы керамічнага посуду захаваліся ў аднячасовых яму пісьмовых дакументах XVII–XVIII стст. Паводле крыніц гэтага часу, сярод глінянага посуду адрозніваюць посуд «просты», «паліваны» і «чорны», што адпавядае тром вядомым тэхналагічным групам (непаліванай, паліванай і дымленай керамікі). Паводле функцыянальнага прызначэння вылучаецца «посуд кухонны» і «посуд дамовы» (у навуковай класіфікацыі – кухонны, што ўключае ў сябе начынне для захоўвання і транспартавання ежы – і сталовы, пад якім разумеецца начынне для ежы, пітва і сервіроўкі стала).

Сярод першай групы ёсць як знаёмыя ўсім формы («гаршчок», «горшокъ, кгарнецъ»), так і посуд, які даўно вышаў з ужытку. Сярод апошніх – рынкі (патэльні на трох ножках); латкі (начынне для тушэння і запякання прадуктаў). Сярод тарнай керамікі ўзгадваюцца начынні, форма якіх захавалася да нашага часу: глякі, збаны, гладышы. Аднак ёсць вядомыя толькі археолагам начынні для напояў: «яндоўкі», «насаткі».

У некаторых выпадках маюць месца прыклады «функцыянальнай семантыкі»: макацёр (макотра, цёрла) (вялікія місы) – начынне, прызначанае для расціrання прадуктаў (маку, тварагу, яечных жаўткоў).

У якасці «посуду дамовага» узгадваюцца звычайна 3 віды начыння для сервіроўкі стала: талеркі, паўміскі і міскі. Для пазначэння начынняў для пітва ўжывалі назвы «куфель» ці «кухель», «кубокъ, кубочекъ, кубечекъ», «кварта». Яны адрозніваліся ў першую чаргу формай, а таксама памерамі.

З'яўленне паліванай керамікі сведчыла пра ўвагу чалавека да культуры спажывання, яе гігіены (таму першыя начынні паліваліся толькі знутры). Аднак паступова новы тэхналагічны набытак скарыстоўваецца і ў эстэтычных мэтах. У гэты час арнамент на посудзе канчаткова страчвае сімвалічную функцыю і набывае рысы адпаведнага мастацкага стылю. Таму гравіраваны (нанесены ў тэхніцы карбоўкі) ці намаляваны ангобам арнамент у эпоху Рэнесансу (канца XVI – пачатку XVII ст.) мае геаметрычны характар (зігзаг, ромбы, трохкутнікі і кампазіцыі на іх аснове), што адпавядае арнаментальным тэндэнцыям і формам гэтай эпохі. Эпоха барока ў посуд другой паловы XVII–XVIII стст. прыносіць раслінныя матывы ў роспіс, хвалепадобны арнамент у тэхніцы гравіроўкі і акруглыя, S-падобныя формы ў архітэктоніку начынняў [4, с. 106, 128, 143, 163].

Аднячасова адбываецца працэс універсалізацыі керамічнай формы: побач са сваёй асноўнай функцыяй – быць ёмістасцю для ежы – кераміка выконвае і функцыю меры для сыпучых і вадкіх рэчываў. Так, гарнец ці паўгарнец – гэта і сасуды, і адпаведныя меры. Тое ж можна сказаць і пра кварту.

XVII ст. – гэта і час пашырэння функцыі керамікі: яна становіцца прадметам інтэр'еру (распісны посуд, выкананы таксама і ў тэхніцы мешчамаёлікі, расстаўляецца на паліцах-гратках ці развешваецца ўздоўж сцен у памяшканнях для прыёму гасцей, дэманстрыруючы тым самым заможнасць гаспадароў. Гэтая тэндэнцыя праявіцца напоўніцу і ў наступным стагоддзі.

### 3. Антрапамарфізацыя керамічнай формы.

Гэтыя з'вы, на думку акадэміка Н. Я. Мара, адлюстраванне адносін «мікракосм-макракосм», калі назвы пераходзілі з органаў чалавечага цела на інструмент ці частку прадмета, які выконваў функцыю гэтага органа.

Яшчэ з эпохі неаліту чалавек адносіўся да гаршка як да жывой істоты. Ускосна пра гэта сведчыць тое, што неалітычныя гаршчкі старанна «прычэсваліся» грабеньчыкам часцей знутры, чым звонку. Пацверджанне антрапамарфізацыі керамічнага начыння – назвы іх частак (ручкі, ножкі, плечукі, шыйка, горла, венца (як вянок на галаве чалавека), носік). У амерыканскіх індзейцаў было прынята рабіць сасуды для пітва з выявамі чалавечага твару (так званыя фігуратыўныя сасуды). У заходнееўрапейскай традыцыі выраб такіх сасудаў-маскаронаў быў пашыраны ў XVII–XVIII стст. Трапляліі такія начынні і на тэрыторыю Беларусі (Гродна, Мінск, Полацк).

Цікавым з'яўляецца адваротны працэс – перанос керамічных вобразаў на чалавечую знешнасць. Прыкладам, сярод керамічных форм XVII–XVIII стст. ёсць разнастайныя начынні з насамі-злівамі рознай формы, прызначаныя для захоўвання і разлівання розных вадкасцяў (алею, піва, віна, гарэлкі) [4, с. 137]. У пісьмовых крыніцах сустракаюцца дзве назвы іх – яндоўка і насатка. Між тым у нашай традыцыйнай культуры вялікі доўгі нос у чалавека жартаўліва называюць «яндоўкаю». Каб падкрэсліць груваcткасць, паўнату чалавека, часам ужываюць параўнанне: «цяжкі як гляк».

Такім чынам, у семіётыцы культуры матэрыяльнае і вербальнае з'яўляюцца звёнамі двух паралельных узаемазвязаных ланцужкоў культуры. І разрыў аднаго з іх ці замяшчэнне звяна чужародным непазбежна прыводзіць да разбурэння першапачатковага культурнага сэнсу. Аналіз керамічнага посуду ад часоў неаліту паказвае, што чалавек з моманту з'яўлення посуду абраў яго паверхню ў якасці своеасаблівага «летапісу» для пазіцыяніравання сябе ў сусвеце, а непасрэдная ўтылітарная функцыя яго – быць ёмістасцю для ежы – была далёка не адзінай.

### ЛІТАРАТУРА

1. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т.1. Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц і інш.; Пад рэд. М. М. Чарняўскага, А. Г. Калечыц. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 424 С.

2. Бауэр, В. Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин. – М.,: КРОН-ПРЕС, 1995. – С. 36.

3. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т.2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А. А. Егарэйчанка, В. И. Шадыра, В. С. Вяргей і інш.; Пад рэд. В. И. Шадыра, В. С. Вяргей. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – С. 502.

4. Здановіч, Н. І. Беларуская паліваная кераміка XI–XVIII стст./ Н. І. Здановіч, А. А. Трусаў. – Мінск . Навука і тэхніка, 1993. –